LIETUVOS RESPUBLIKOS ŠVIETIMO IR MOKSLO MINISTERIJA
NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS

**2008**

______________________________________________
(Rajonas/miestas, mokykla)

_____ klasės moksleivio(-ės) ______________________________
(Vardas, pavardė)

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## (BALTARUSIŲ KALBA)

## Тэст па беларускай мове і літаратуры
## (Testas)

**Праверачныя заданні 2008 г. за курс асноўнай школы**

**2008 m. pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduotis**

**12 чэрвеня 2008 г.** **Час – 1 гадзіна 30 хвілін**

**ТЛУМАЧЭННІ:**

- Праверце, ці няма пустых аркушаў ці іншых дэфектаў друку ў вашым тэксце. Калі заўважыце, паведамце настаўніку.
- Пісаць можаце і алоўкам, але канчатковы варыянт павінен быць напісаны ручкай сіняга колеру. Выкарыстоўваць карэктар забаронена.
- Будзе ацэньвацца і культура вашага пісьма: невыразна напісаныя, закрэсленыя адказы не будуць ацэнены (г.зн. за гэты адказ вы атрымаеце 0 балаў).
- На пытанні тэста адказвайце коратка і зразумела. Вашы адказы павінны змясціцца ў адведзеных радках.

**VERTINIMAS**

| Užduotys | Maksimalus taškų skaičius | Surinktų taškų suma | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1 vertintojas | 2 vertintojas | 3 vertintojas |
| | | | | |
| | | | | |
| Taškų suma | | | | |

| TAŠKAI | |
|---|---|

Vertinimo komisijos pirmininkas: ______________________
(Parašas, vardas ir pavardė)

Vertintojai: ______________________
(Parašas, vardas ir pavardė)

______________________
(Parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2008

***Прачытайце ўрывак з апавядання М. Зарэцкага "Дзіўная" і выканайце заданні 1 –13***

Усміхнулася вясна гулліва, сонечна. Так усміхнулася, што сівавалосая бабулька-зямля зусім растала, захлібнулася з радасці. Недалужна заслязілася цурочкамі спрытнымі, кроплямі звонкімі слюнява хліпнула. Зашамкала вуснамі старчымі, голасам шопатным, ціхім.

А потым зарумзала. Ды так зарумзала, так загаласіла, што ўвесь горад шумам напоўніла, патокай слёз заліла.

А як наплакалася даволі, салодка ўсміхнулася мокрымі, бляскам аблітымі вуліцамі, пачала выцірацца шаўковымі коскамі сонейка.

І пачулася тады, што зямля не такая ўжо бабулька старая. Толькі гэткай прыкінулася, а сапраўды - вунь яна: смяецца задорна, молада, звініць птушкамі шустрымі, пярэстай, гаварлівай грамадой людзей разліваецца. Зусім маладуха!

***Заданні 1 –13 ( 22,5 бала)***

*Балы 1 2*

1. Вызначце асноўны настрой урыўка.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

*(1 бал)* __ __

2. Якія ніжэй пералічаныя асаблівасці ўласцівыя для гэтага ўрыўка? Правільныя варыянты адказу абвядзіце.

   А) Разважанне
   Б) Апісанне
   В) Дыялагічнасць
   Г) Эмацыянальнасць

*(1 бал)* __ __

3. У першым сказе знайдзіце прыклад інверсіі (*парушэнне парадку слоў*). Якое слова выдзеліў аўтар з яе дапамогай?

________________________________________

*(1 бал)* __ __

3.1 Вызначце мастацкае значэнне гэтай інверсіі.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

*(2 балы)* __ __

| Сума балаў за заданні 1–3 | | |
|---|---|---|

*Балы*
*1* *2*

4. Да якога віду тропа можна аднесці ўвесь гэты ўрывак? Правільны адказ абвядзіце.

   А) Метафара
   Б) Эпітэт
   В) Параўнанне

*(1 бал)* __ __

5. Да слова ***вясна*** падбярыце 4 дзеяслоўныя метафары.

________________________________________

________________________________________

*(2 балы)* __ __

6. Як вы думаеце, чаму ў фальклорных творах вясна звычайна параўноўваецца з маладой, прыгожай дзяўчынай?

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

*(2 балы)* __ __

7. Растлумачце значэнне слова ***маладуха***.

________________________________________

________________________________________

*(2 балы)* __ __

8. У творчасці шэрагу пісьменнікаў вобраз вясны з'яўляецца сімвалам адраджэння беларускага народа. Растлумачце сэнс гэтай сімволікі.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

*(2 балы)* __ __

| Сума балаў за заданні 4–8 | | |
|---|---|---|

*Балы*
*1 2*

9. Растлумачце значэнне фразеалагізму *Вясна вочы крадзе.*

*(2 балы)*

10. У чатырох прыслоўях, выкарыстаных у тэксце і ўтвораных ад назоўніка, графічна вызначце іх спосаб ўтварэння.

*(2 балы)*

11. Перабудуйце наступны сказ такім чынам, каб у ім ужываўся зваротак.
*Усміхнулася вясна гуллівa, сонечна.*

*(1 бал)*

12. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі.

1. з радасці;
2. горад напоўніла;
3. усміхнулася вясна;
4. наплакалася даволі.

*(1 бал)*

13. У табліцы насупраць прыкладу пры дапамозе знака + пазначце, супадае ці не супадае вымаўленне слова з яго напісаннем. Пад нумарам 0 даецца ўзор.

| № | Прыклад | Супадае | Не супадае |
|---|---|---|---|
| 0. | сапраўды | + | |
| 1. | горад | | |
| 2. | пачулася | | |
| 3. | салодка | | |
| 4. | слёз | | |
| 5. | мокрымі | | |

*(2,5 бала)*

| Сума балаў за заданні 9–13 | | |
|---|---|---|

| **Сума балаў за заданні 1–13** | | |
|---|---|---|

***Прачытайце верш Н.Мацяш і выканайце заданні 14-23 (20,5 бала)***

***

Панянькавала за свой век нямала
Мар, і памкненняў, і жаданняў я,
А заклінаю так, як заклінала:
Хай беражэ цябе любоў мая.

Заступіць хай усе шляхі-дарогі
Любой нягодзе і любой слаце,
Каб, як хваробы, роспачнай знямогі
Ніколі не спазнаў твой доўгі дзень.

Якім ты ёсць і стаць якім гатовы, -
Хай светлай будзе лёсу каляя! -
Ад злой няўдачы, ад ліхой намовы
Хай беражэ цябе любоў мая.

За сэнс высокі, што жыццё займела,
За мой вясёлкаю замкнёны круг,
Дажджынкай шызай ці сняжынкай белай
Я прыпаду к табе і паўтару:

Дзе б ты ні быў, якой бы ні была я
І кім бы для цябе ні стала я, -
Хай над табою ластаўкай крыляе,
Хай беражэ цябе любоў мая.

*Балы* 
*1* *2*

14. Да якога лірычнага жанру адносіцца гэты верш? Правільны адказ абвядзіце.

А) Ода
Б) Элегія
В) Лірычны маналог
Г) Эпіграма

*(1 бал)* __ __

15. Да каго звяртаецца лірычная гераіня верша?

___

*(1 бал)* __ __

16. Растлумачце сэнс першых двух радкоў верша.

___

___

(2 *балы)* __ __

| Сума балаў за заданні 14–16 | | |
|---|---|---|

*Балы*
*1 2*

17. Якой паўстае перад чытачом лірычная гераіня?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(2 балы)*

18. Якую ролю ў вершы адыгрывае сказ *Хай беражэ цябе любоў мая*?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(2 балы)*

19. Н.Мацяш калісьці напісала: "...маё наканаванне: сцвярджаць шчасце мовай смутку". Абапіраючыся на змест верша, пракаменціруйце гэтыя словы паэтэсы.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(3 балы)*

20. Растлумачце знакі прыпынку ў наступных сказах. Пасля нумару знака прыпынку пастаўце выбранае тлумачэнне пад пэўнай літарай. Пад нумарам 0 даецца ўзор.

*Паняньkавала за свой век нямала*

Мар, (0) ______і памкненняў, (1) _____ і жаданняў я, (2) ________
А заклінаю так, (3) _________як заклінала: (4) ________
Хай беражэ цябе любоў мая. (5) ________

Заступіць хай усе шляхі-дарогі
Любой нягодзе і любой слаце, (6) ________
Каб, (7) ______ як хваробы, (8) ________ роспачнай знямогі

Ніколі не спазнаў твой доўгі дзень. (9) _________

**А** – заканчэнне апавядальнага сказа;
**Б** – аднародныя члены сказа;
**В** – дададаная частка складаназалежнага сказа;
**Г** – часткі складаназлучанага сказа;
**Д** – параўнальны зварот;
**Е** - часткі складанага бяззлучнікавага сказа.

*(4 балы)*

| Сума балаў за заданні 17–20 | | |
|---|---|---|

*Балы*
*1* *2*

21. Да наступных слоў падбярыце аднакарэнныя словы такім чынам, каб націскное *е* не пад націскам перайшло ў ***я***.

век – ______________________________

дзень – ______________________________

белай – ______________________________

светлай – ______________________________

*(1 бал)* __ __

22. Да дзеяслова *беражэ* з паэтычнага радку *Хай беражэ цябе любоў мая* падкрэсліце словы-сінонімы сярод наступных слоў:

сцеражэ, ахоўвае, адкладае, ашчаджае, шануе, засцерагае, эканоміць, збірае, зберагае.

*(2,5 бала)* __ __

23. Устанавіце адпаведнасць паміж прыведзенымі ў левай калонцы прыкладамі і іх сэнсавымі характарыстыкамі. Правільны адказ адзначце нумарам, які адпавядае прыкладу.

| 0. Любой нягодзе і любой слаце | 0. Сінонімы |
|---|---|
| 1.Дажджынкай шызай ці сняжынкай белай | Мнагазначныя словы |
| 2. Шляхі-дарогі, чыгуначны шлях, шлях праз балота, збіцца са шляху, накіраваць на правільны шлях | Амонімы |
| 3. Мар, і памкненняў, і жаданняў | Антонімы |
| 4. Лёсу каляя – каляя за білетамі | Сінонімы |

*(2 балы)* __ __

| Сума балаў за заданні 21–23 | | |
|---|---|---|

| **Сума балаў за заданні 1–23** | | |
|---|---|---|